ИНТЕЛЛЕКТУАЛЬНОЕ ШОУ



# «БРЕЙН-РИНГ в Воробьевичах»



## «Историко-культурное
## едие нашего края»

***Воробьевичский СДК-ЦТТ***
***31 марта 2016 года, 14.00***

**ИНТЕЛЛЕКТУАЛЬНОЕ ШОУ**



# «БРЕЙН-РИНГ в Воробьевичах»

*посвящается Международному дню памятников и исторических мест —*

***Дню всемирного наследия,*** *—*

*ежегодно отмечаемому 18 апреля по решению ЮНЕСКО*

Организаторы мероприятия:

Воробьевичский СДК-ЦТТ,

ГУО «Воробьевичский УПК детский сад — средняя школа»

ИНТЕЛЛЕКТУАЛЬНОЕ ШОУ



# «БРЕЙН-РИНГ в Воробьевичах»

**Содержание вопросов брейн-ринга отвечает целям и задачам выполняемых в Республике Беларусь государственных программ:**

- ГП "Образование и молодежная политика" на 2016 – 2020 годы;
- ГП "Культура Беларуси" на 2016 – 2020 годы;
- ГП "Охрана окружающей среды и устойчивое использование природных ресурсов" на 2016 – 2020 годы;
- ГП "Беларусь гостеприимная" на 2016 – 2020 годы;
- ГП "Развитие цифровой экономики и информационного общества";
- ГП "Белорусский лес" на 2016 – 2020 годы

# План-схема Осташинского сельсовета



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**

**у Вераб'евічах»**

## Намінацыя №1

# «Адметныя дзеячы навукі і культуры нашага краю»









ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб'евічах»**

# Пытанне №1

**Назавіце прозвішча вядомага гісторыка і мемуарыста XVI стагоддзя, які валодаў маёнткам у Нянькаве. Ахарактарызуйце яго навуковы ўнёсак у беларускую гістарыяграфію.**



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ
**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб’евічах»**

# Адказ:

**Фёдор Еўлашоўскі — падсудак Навагрудскі, гісторык і літаратар, аўтар першага мемуарнага твора XVI стагоддзя (манускрыпта «Гістарычныя запіскі»), уладальнік маёнтка ў Нянькаве.**



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ
**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб'евічах»**



# Пытанне №2

**Назавіце прозвішча нашага земляка, які атрымаў адукацыю у Дэрптскім універсітэце і дасягнуў значных вынікаў у галіне прыродазнаўства. Адзін з першых пачаў сістэмнае даследванне флоры і фаўны Навагрудчыны.**

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**

**у Вераб'евічах»**



## Адказ:

Дыбоўскі Уладзіслаў Іванавіч, навуковец-прыродазнаўца. За ўдзел у паўстанні **1863** года Дыбоўскі быў пазбаўлены магчымасці займацца навукай. Паколькі па стану здароўя ён не мог працаваць прафесарам універсітэта, у **1879** годзе пераехаў да сястры ў вёску Нянькава, дзе разгарнуў living розначаковую даследчыцкую і творчую дзейнасць.
Збіраў гербарый на берагах возера Свіцязь, вывучаў мелавую навагрудскую фаўну. Таксама займаўся фалькларыстыкай, пісаў артыкулы пра метэаралагічныя з'явы, нумізматыку. Уладзіслаў Дыбоўскі пражыў у маёнтку Нянькаў больш за **25** гадоў. Памёр у **1910** годзе, пахаваны ў вёсцы Войнава Навагрудскага раёна.

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**

**у Вераб’евічах»**



# [Пытанне №3]

**Назавіце прозвішча выдатнага палкаводца, генерала рускай арміі, які вызначыўся ў Айчыннай 812 года,**

**адальніка маёнткаў Уселюб, Бардзячы і**



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ
**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб'евічах»**



# Адказ:

**Джозэф О'Рурк (Іосіф Карнілавіч О'Рурк) (1770 – 1849) — генерал, удзельнік Італьянскага похода Суворава, вайны 1809—1811 гадоў з Турцыяй, бітваў пад Аўстэрліцам, Прэслаў і Лейпцыгам. Удзельнік Венскага кангрэса 1815 года.**



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ
«БРЭЙН-РЫНГ
у Вераб’евічах»



## Пытанне №4

**Назавіце прозвішча нашага земляка — выдатнага мовазнаўцы, прафесара Берлінскага ўніверсітэта імя Гумбальта, аўтара больш чым 100 навуковых прац па пытаннях гісторыі і сучаснай беларускай мовы.**

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ у Вераб’евічах»**



# Адказ:

**Лазоўскі Уладзімір Міхайлавіч — вядомы беларускі мовазнавец, прафесар, аўтар многіх падручнікаў і дапаможнікаў па беларускай мове, нарадзіўся і вырас у вёсцы Нянькава.**
**У 1981—1985 гадах выкладаў беларускую мову ў Берлінскім універсітэце імя В. Гумбальта. Узнагароджаны ганаровым залатым медалём Гердэра.**

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ
**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб'евічах»**



## Пытанне №5

**Назавіце нашага земляка — выдатнага дзеяча культуры, педагога, гісторыка-краязнаўцу, музеязнаўцу, стваральніка і кіраўніка аднаго з найбольш цікавых рэгіянальных народных музеяў Наваградчыны.**
**Нарадзіўся ў 1930 годзе ў вёсцы Антонаўка.**

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ
«БРЭЙН-РЫНГ
у Вераб'евічах»



Адказ:

**Карповіч Міхаіл Міхайлавіч працаваў дырэктарам Любчанскай сярэдняй школы, занесены ў Кнігу Славы Навагрудскага раёна.**
**Стваральнік і кіраўнік музея Любчанскага краю.**

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**

**у Вераб’евічах»**

# Намінацыя №2

# «З гісторыі вёсак нашага краю»



## Пытанне №6

**Назавіце самую старую вёску нашага сельсавета, вядомую яшчэ з сярэднявечча. Якія гістарычныя падзеі і імёны перыяда ВКЛ непарыўна звязаны з гэтай вёскай?**

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ
**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб'евічах»**

# Адказ:

**Гэта вёска Асташына, якая згадваецца ў летапісах першай паловы XV стагоддзя. Упершыню вёска Асташына ўпамінаецца ў гістарычных крыніцах, дацiраваных 1401 годам, — у даравальнай грамаце вялікага князя літоўскага Вітаўта. Згодна з гістарычным дакументам Вітаўт перадае вёску Асташына свайму брату Жыгімонту.**
**Далей вёскай валодала трэцяя жонка Вітаўта Юльяна Гальшанская, шляхецкія роды Чартарыйскіх, Саламярэцкіх і Радзівілаў.**

## Пытанне №7

**Назавіце вёскі, што ўзніклі ў часы сталыпінскай аграрнай рэформы і зніклі ў перыяд калектывізацыі.**

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ
**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб’евічах»**

# Адказ:

**Вёска Жудзілава, якая дзялілася на тры часткі: Жудзілава Вераб'евіцкае, Жудзілава Антонаўскае (самае вялікае з трох — 24 двары) і Жудзілава Поўберагскае.**
**На жаль, праіснаваўшы ўсяго каля двух дзясяткаў гадоў, у 1930-я гады зніклі вёскі Парaслі (15 двароў) і Шырнеўка (6 двароў).**

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**

**у Вераб’евічах»**

# Пытанне №8

**Назавіце самую маладую вёску нашага сельсавета.**

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ
**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб'евічах»**

# Адказ:

**Вёска Антонаўка. Упершыню ўпамінаецца ў ходзе перапісу насельніцтва, які праводзіўся па загаду Мікалая II у 1897 годзе.**
**Назву атрымала ад імені яе ўладальніка — Антона Шыманскага.**

## Пытанне №9

**Калі ўпершыню ў летапісах згадваецца вёска Поўбераг?
Якія паданні звязаны з яе назвай?**

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ
**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб’евічах»**

# Адказ:

**1428 год, узгадана ў сувязі з падараваннем Вітаўтам трэцяй жонцы Юльяне Гальшанскай у якасці вена.**

У далёкія часы была вёска Каласоўка. Яе называлі так з-за таго, што многа год запар жыхары гэтай вёскі сеялі толькі жыта. І вось з’явіліся ў Каласоўцы вялікім гуртам перасяленцы з новай культурай земляробства, але тутэйшыя не захацелі прымаць новага і не дазволілі прышлым пасяліцца ў сваёй вёсцы.
Ды толькі не маглі яны проста так прагнаць перасяленцаў, а абяцалі ім дапамагчы наладзіць жыццё ў іншым месцы. І за 42 вярсты ад Каласоўкі пабудавалася новая вёска, дзе і пасяліліся прышлыя людзі. Доўга не маглі прыдумаць назву новаму паселішчу. Але адзін з жыхароў Каласоўкі, які дапамагаў перасяленцам вясною, заўважыў:
-Цяпер вясна наступіла, а ў вашай рэчцы паўберага вады. У нас жа кожную вясну поўная рака. Давайце назавём ваша паселішча ПАЎБЕРАГ.

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**

**у Вераб'евічах»**

## Намінацыя №3

# «Помнікі мінулай вайны»



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ
**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб’евічах»**



## Пытанне №10

**Пазнайце помнік.**
**Каму ён прысвечаны, дзе і калі ўстаноўлены?**

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**

**у Вераб’евічах»**



# Адказ:

**Помнік землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны. Устаноўлены ў 1967 годзе ў вёсцы Вялікія Вераб'евічы.**

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб’евічах»**




## Пытанне №11

**Пазнайце і назавіце помнік. Якія падзеі ён увекавечвае, дзе і калі ўстаноўлены?**



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**

**у Вераб’евічах»**




# Адказ:

**Помнік ахвярам Халакосту, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны ў працоўным лагеры вёскі Малыя Вераб’евічы. Лагер быў створаны немцамі для будаўніцтва брукаванай шашы Навагрудак — Любча. Помнік увакавечвае памяць аб 950 загінуўшых яўрэях. Установлены ў весцы Малыя Вераб'евічы ў 1961 годзе. Адноўлены ў 2004 годзе.**



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**

**у Вераб’евічах»**

# Пытанне №12

**Пазнайце і назавіце помнік.**

**Якія гераічныя падзеі ён увекавечвае, дзе ён ўстаноўлены?**



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ
**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб'евічах»**

# Адказ:

**Помнік партызанам атрада імя Катоўскага братам Сонцавым (сапраўдныя імёны герояў — Мікалай і Уладзімір Чабуравы), якія гераічна загінулі 8 чэрвеня 1942 года.**
**Помнік установлены у лесе Чашчы за паўкіламетра на захад ад вёскі Валосаўкі. Гэтае месца мае назву Мацейкаў Роў.**



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ
**«БРЭЙН-РЫНГ
у Вераб'евічах»**

## Пытанне №13

**Пазнайце і назавіце помнік.
У гонар якой гераічнай асобы ён узведзены? Дзе ён устаноўлены?**



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб’евічах»**

# Адказ:

**Помнік ушаноўвае памяць сакратара падпольнай камсамольскай арганізацыі вёскі Поўбераг у 1941—1943 гады Паўліны Паўлаўны Дзедулевіч.**
**Устаноўлены на поўберагскіх могілках.**



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**

**у Вераб'евічах»**

# Намінацыя №4

# «Архітэктурныя скарбы краю»



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ
«БРЭЙН-РЫНГ
у Вераб'евічах»



# Пытанне №14

**Пазнайце і назавіце архітэктурны помнік, што вы пра яго ведаеце, калі ён збудаваны?**



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб'евічах»**



# Адказ:

**Будынак Асташынскай базавай школы — былы маёнтак Паздзернік, збудаваны напрыканцы XVIII стагоддзя. Маёнткам валодалі шляхецкія роды Петрушкевічаў, Чачотаў і іншыя. Адметнасцю будынка з'яўляюцца казематныя падвалы і адзіны на Беларусі тэрасавы парк (гэта значыць, што парк размешчаны на чатырох узроўнях — чатырох тэрасах). Перапад вышынь**
**...аў. Парк займае больш за пяць**
**...адметны незвычайнымі і рэдкімі**
**...веймутава і сібірскай**



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**

**у Вераб'евічах»**

# Пытанне №15

**Пазнайце і назавіце страчаны архітэктурны помнік. Што Вы пра яго ведаеце, калі ён быў разбураны?**



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**

**у Вераб'евічах»**

# Адказ:

**Будынак сядзібнага дома Раецкіх, Дыбоўскага ў Нянькаве. Згарэў 21 лютага 1944 года.**



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ
**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Верабʼевічах»**

# Пытанне №16

**Пазнайце і назавіце помнік.**
**Калі ён быў збудаваны і з якімі падзеямі ён звязаны?**



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**

**у Вераб'евічах»**

# Адказ:

**Помнік Адаму і Эвеліне Пуслоўскім ля вёскі Загор'е Сененскае. Пастаўлены ў канцы XIX стагоддзя. Непасрэдна звязаны з трагічнымі падзеямі паўстання 1863—1864 гадоў.**

**20-гадовы студэнт Кракаўскага Ягелонскага ўніверсітэта Адам Пуслоўскі ўзначальваў атрад, які прымаў удзел у баявых дзеяннях супраць царскіх войск усяго адзін дзень.**

**Пуслоўскі быў палонены і пакараны смерцю ў Наваградку 26 чэрвеня 1863 годзе.**

**Яго маці Эвеліна тайна пахавала сына ў сваіх уладаннях. Сама ж памерла ў 1880 годзе.**



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ
**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб'евічах»**

# Пытанне №17

**Пазнайце і назавіце архітэктурны помнік.**
**Калі ён быў збудаваны,**
**якія гістарычныя звесткі**
**аб гэтым помніку вы**
**ведаеце?**



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ
**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб’евічах»**

# Адказ:

**Гэта царква Свята-Раства Багародзіцы ў Поўберазе.**
**Упершыню ў летапісах царква ў Поўберагу згадваецца пад 1652 годам – як царква Марыі.**
**У 1798 годзе ў вёсцы Поўбераг, на той час — цэнтры ўніяцкай парафіі, існавала драўляная царква Раства Багародзіцы. На працягу першай чвэрці XIX стагоддзя будынак царквы гарэў тры разы, а сучасны выгляд царква набыла ў 1839 годзе, калі на ўсходняй ускраіне вёскі праваслаўныя вернікі ўзвялі свой храм у гонар Раства Багародзіцы.**



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**

**у Вераб’евічах»**

# Намінацыя №5

# **«Тапаніміка»**

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ
**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб'евічах»**

# Пытанне №18

**Назавіце тапанімічны аб'ект, прадэманстраваны на слайдзе. Адкуль пайшла яго назва?**



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**

**у Вераб’евічах»**

# Адказ:

Гэта — Гольманка, дарога ад вёскі Поўбераг да лесу Чашчы.
Сваю назву яна атрымала дзякуючы наступнай легендзе.
Калісьці на гэтым месцы працякала рака Гольма. Яна была падобная на прорву з высокімі і крутымі берагамі. На берагах гэтай ракі ў далёкія часы жыў народ Ка, вельмі дружалюбны і гасцінны. Але быў сярод іх адзін дужа пагардлівы чалавек, які ніколі не слухаў чужых парадаў, нават слушных, і заўсёды адказваў: “Не, з гэтага нічога не будзе!”
І вось ён быў за сваю пагарду пакараны Богам.
Аднойчы, калі той чалавек падыйшоў да абрывістага берага Гольмы і стаў пазіраць у цемень яе вод, бераг абваліўся, і ён паляцеў у прорву. А падаючы, крычаў супляменнікам і рацэ:
— Гольма! Выкінь мяне назад!
Ты — самая вялікая рака! А народ Ка — самы дружалюбны народ!
Пачуўшыя яго, супляменнікі толькіківалі галовамі і казалі: “Вось. Упершыню пачулі ад яго такія добрыя словы”.
А чалавек усё крычаў:
— Гольма! Ратуй! Я – народ Ка! Гольма! Ратуй!
Я — народ Ка!..
З неба бліснула маланка, загрукатаў гром, паліў моцны лівень, і народ Ка схаваўся ад непагадзі. Пасля дажджу ўсе неўзабаве агледзелі, што рака ператварылася ў віхлястую палявую дарогу, якую потым і назваалі — Гольманка.



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ
**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб'евічах»**

# Намінацыя №6

# «Нашы лясы»

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**

**у Вераб'евічах»**

# Пытанне №19

За вёскай Валосаўкай знаходзяцца тры прыкметныя горкі, паросшыя лесам.

Якія гістарычныя падзеі, звязаныя з ім, паўплывалі на іх народную назву?





ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**

**у Верабʼевічах»**

# Адказ:

Так званыя «Французскія горкі» ля вёскі Поўбераг, якая ў Айчынную вайну **1812** года аказалася на шляху французскай арміі. Аб гэтым сведчаць і знойдзеныя там затвор мушкета і фрагмент гарматнага ядра. Яшчэ адным сведчаннем знаходжання французаў у Поўберазе зʼяўляецца сама назва «Французскія горкі», дзе нібыта пахаваны забітыя на пераправе праз Нёман ля вёскі Мікалаева салдаты войск Жэрома Банапарта.





## Пытанне №20

У гэтым лесе вельмі шмат бярозавых ускраін-гаёў, а таксама ёсць возера з трытонамі. Назавіце тапонім гэтага ляснога масіву, які знаходзіцца на паўночным захадзе ад вёскі Поўбераг? І што кажа легенда пра паходжанне гэтай назвы?

# Адказ:

Гэта лес Чашчы. Паходжанне яго назвы абумоўлена наступнай легендай:

На тым месцы, дзе зараз знаходзіцца лес Чашчы, у даўно забытыя часы стаяў горад Чашч. Насельнікі гэтага горада славіліся добразычлівасцю і гасціннасцю. Але ў тым горадзе жыў злы чараўнік, які зайздросціў усім гараджанам і стараўся рабіць ім зло.

І вось ён так узненавідзеў жыхароў Чашча, што вырашыў ператварыць іх у дрэвы. Цёмнай ноччу ён, поўны гневу, пачаў чараваць і наклікаць бяду на мірны горад. Ён так распаліўся ў сваім гневе, аж забыўся на тое, што ён сам — жыхар гэтага горада. Чарадзейства адбылося. У выніку яго прыгожы горад ператварыўся ў прыгожы лес, а самым старым і крывым дрэвам у ім стаў сам чараўнік, які ў час сваёй злой справы стаяў сагнуўшыся...

І з тых часоў у гонар горада добрых людзей гэты лес пачалі называць Чашчамі.

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ
**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб’евічах»**

# Пытанне №21

У гэтым лесе адбыліся цікавыя гістарычныя падзеі ў час паўстання **1830—1831** гадоў, калі мясцовыя сяляне спрабавалі адваяваць права на вольнае карыстанне лесам у графа О'Рурка.
Што гэта за лес, дзе ён знаходзіцца і як гэтыя падзеі адлюстраваны ў вуснай народнай творчасці?

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ
**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб'евічах»**

# Адказ:

Гэта лес Ступішчы, які мяжуе з вёскамі Рэцемля і Масцішча.
А пра этымалогію назвы «Ступішча» паданне расказвае наступнае...
Каля сучаснага лесу Ступішча некалькі стагоддзяў назад была вёска і даволі шматлюдная (магчыма, гэта -- Рэцемля.) Усе жыхары гэтай вёскі былі ў асноўным бедныя і толькі адзін быў багацейшым. Ён быў злы, помслівы, зайздросны, пану падліза і, нават казалі, што ён сябруе з чортам.
І вось пан, які валодаў навакольнымі землямі, напісаў таму багатаму чалавеку ліст, каб сялянская грамада перадала ў валоданне пану два лясы, якія знаходзіліся паблізу вёскі. Багаты селянін склікаў сход і абвясціў панскі ліст.
Сяляне ж, параіўшыся, вырашылі перадаць пану адзін лес, а другі, бліжэйшы, пакінуць у агульным валоданні вёскі, бо без лесу яны не змогуць пражыць.
А лес даваў вёсцы дровы, матэрыял для будаўніцтва, ягады, грыбы, арэхі. Такі адказ і паслалі пану. Тады пан звярнуўся да грамады з прапановай, каб выкупіць у іх лес за вялікія грошы. Але сяляне не пагадзіліся, бо не ўяўлялі сабе жыцця без гэтага лесу. У адказ пан, раззлаваўшыся, папярэдзіў, што забярэ лес сілай. А сяляне вырашылі стаяць да апошняга і пачалі ўзбройвацца.

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

# «БРЭЙН-РЫНГ у Вераб’евічах»

Зброя ў іх была самая прымітыўная: сякеры, косы і г. д. Парабілі нават з арэшын лукі і конскім воласам замест цецівы, коп’і з касцянымі наканечнікамі, а стрэлы — з бэзу.
Але гэтай зброі было мала: сяляне прадалі пэўную колькасць драўніны, набылі сабе тое-сёе з агнястрэлаў. У пана ж было больш людзей і лепшае ўзбраенне, бо грошай было больш...
І вось настаў той дзень...
Дазорны селянін з высокага дрэва заўважыў панскае войска і папярэдзіў аднавяскоўцаў. Панскі дарадчык параіў пану раздзяліць войска на дзве часткі: адну з іх выправіць прама на вёску, а іншую -– у абход, з мэтай акружыць непакорных сялян. Пан так і зрабіў. Пачалася страшэнная бойка. Многіх сялян пазабівалі, дасталося і панскаму войску, але сілы былі далёка не роўныя. Пан з памагатымі ў рэшце рэшт перамог. Тыя, хто застаўся ў жывых, ад сялянскай грамады былі вымушаны падпісаць дабравольную перадачу лесу пану. Так сяляне саступілі.
У гонар тых сялян, якія мужна змагаліся за свой лес, за сваё права ім распараджацца і загінулі, але ўсё ж саступілі пану, і быў ён названы — Ступішча.

# Пытанне №23

У гэтым лясным масіве знаходзіцца пасадка даволі рэдкай для нашай мясцовасці расліны — коркавага дуба. Зараснікі коркавага дуба займаюць плошчу амаль паўгектара. Сам масіў закранае тэрыторыі трох аграпрадпрыемстваў Навагрудскага раёна і па плошчы саступае толькі Налібоцкай пушчы.
З гэтым лесам звязана цікавае паданне, якое і адбілася ў яго назве. Што гэта за лес, у чым сэнс падання?

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**

**у Вераб'евічах»**

# Адказ:

Гэта лес Нямераўшчына. Паходжанне яго назвы абумоўлена наступным паданнем.

У даўнія часы жыў і працаваў у гэтым лесе ляснік. Пасля яго смерці засталіся ў бацькавай хаце два сыны. Як водзіцца, спадчына малодшаму дастаецца.

А старэйшы паехаў кудысьці ў сваты, ажаніўся, ды там і застаўся. Старэйшы брат займеў жонкай шляхцянку, у якой валодання было — 10 двароў. Гаспадарлівы хлопец — ён вымераў свае новыя ўладанні ўласнымі крокамі,

аб чым і паведаміў лістом свайму малодшаму брату. А меншы быў дужа зайздросны і да таго ж малаадукаваны. Ён вырашыў таксама крокамі абмераць свой лес, але хутка спыніўся перад невырашальнай задачай:

ён умеў лічыць толькі да 20-ці, а далей збіваўся. Мераў доўга, але безвынікова. Тады ж ён прыдумаў мераць дваццаткамі, але і іх не хапала,

бо дваццатак было толькі 20.

Ды ўпартасць брала сваё: малодшы брат ізноў пачынаў і ізноў памыляўся... Доўга хадзіў ён па лесе, пакуль не сустрэў сваю смерць у кіпцюрах дзікіх звяроў.

Ад таго часу і застаўся лес не памераны і назву сваю данёс да нашага часу — Нямераўшчына.

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб'евічах»**

# Намінацыя №6

# «Геральдычная спадчына»










ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**

**у Вераб’евічах»**

# Пытанне №24

Каму належаў і калі быў зацверджаны герб, які вы бачыце на слайдзе?



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ
**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб'евічах»**




# Адказ:

Гэта старажытны ірландскі герб роду графаў О'Руркаў.
У **1848** годзе Джозэф О'Рурк хадайнічаў перад царом, каб яму і яго нашчадкам было дазволена называцца ірландскімі графамі. Мікалай I напісаў на прашэнні: «Так таму і быць».
Вось фрагмент гістарычнага дакумента:
«Найвышэй зацьверджаным **1848.11.24** меркаваньнем Дзяржаўнай Рады дазволена карыстацца ў Расейскай Імперыі тытулам "ірландзкіх графаў" гэнералу ад кавалерыі Іосіфу Карнеліевічу, з сынамі, ягоным пляменьнікам — ротмістру Карнэлію, з сынамі, гэнерал-маёру Вальдэмару і падпалкоўніку Морыцу Георгіевічам О'Рурках, з гледзішча таго, што іх продак паступіў у расейскую службу з графскім тытулам і ягоныя нашчадкі стала яго ўжывалі».

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**

**у Вераб’евічах»**

# Пытанне №25

Што гэта за герб?

Які род з вёскі Нянькава меў дазвол ім карыстацца?



ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**

**у Вераб'евічах»**



# Адказ:

Гэта старажытны беларускі шляхецкі герб «Сыракомля», якім больш за чатыры стагоддзі карыстаўся род Вайніловічаў.

Першае ўпамінанне пра род Вайніловічаў адносіцца да **1487** года, калі наваградчанін Стэцка Вайніловіч плаціў даніну вялікаму князю Казіміру.

Падчас перапісу войска ВКЛ **1557** года ўпамінаюцца ў Нянькаве тры браты Вайніловічы, што выстаўлялі ў войска **3** кані.

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ у Вераб'евічах»**

# Пытанне №26

На слайдзе — старажытны герб Астоя, якім карысталіся больш за **200** шляхецкіх радоў ВКЛ. Адзін з іх — Чачоты. З якой вёскай нашага краю непарыўна звязаны гэты адметны род? Якога вядомага дзеяча беларускай культуры даў радзіме род Чачотаў?





ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ШОУ

**«БРЭЙН-РЫНГ**
**у Вераб'евічах»**




# Адказ:

Чачоты валодалі вёскай Асташына — найбольш старажытнай вёскай Наваградчыны — на працягу ўсяго XIX стагоддзя. Але знакаміты беларускі і польскі паэт, фалькларыст і этнограф, мовазнаўца Ян Чачот нарадзіўся не ў Асташыне, а ў вёсцы Малюшычы Навагрудскага павета.

